Прыярытэты

# НА ВАРЦЕ МІРНАГА НЕБА

## Новыя знішчальнікі заступілі на баявое дзяжурства

**У канцы мінулага года ў нашу краіну сталі паступаць самалёты Су-30СМ. Шматмэтавыя знішчальнікі лічацца ў свеце самымі сучаснымі. Яны прызначаны для вядзення паветранага бою, заваявання лідарства ў паветры, знішчэння паветраных цэляў у любы час сутак, у простых і складаных метэаралагічных умовах, а таксама на фоне зямлі незалежна ад актыўных ці пасіўных перашкод. Таксама ў функцыянал СУ-30СМ уваходзіць адбіццё масіраваных налётаў праціўніка, у тым ліку і крылатых ракет, прыкрыццё сваіх войскаў і аб'ектаў ад удараў з паветра.**





Першыя відэакадры палётаў Су-30СМ падчас вырашэння задач баявога выкарыстання Міністэрства абароны паказала каля месяца таму. Наземныя цэлі паражаліся пры дапамозе авіябомбаў, некіраваных ракет і снарадаў з 30-міліметровых гармат.

Кантракт на пастаўку самалётаў быў заключаны паміж Беларуссю і Расіяй у 2017 годзе. Сёння гэтыя знішчальнікі пастаўляюцца Узброеным Сілам Расіі і Казахстана. У нашы Ваенна-паветраныя сілы паступіць 12 паветраных суднаў.

І вось 1 ліпеня, напярэдадні Дня Незалежнасці, лётчыкі 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы ВПС і войскаў СПА заступілі на баявое дзяжурства на СУ-30СМ, каб ахоўваць паветраныя межы нашай краіны. А гэта значыць — быць гатовымі да таго, каб ускрыць паветраную атаку праціўніка і знішчыць паветраныя цэлі-парушальнікі.

Магчымасці новых знішчальнікаў журналістам паказалі ў сераду падчас адмысловага палёту Су-30СМ.

— Ахова дзяржаўнай граніцы ў паветранай прасторы — адна з тых задач, што ўскладзены на Узброеныя Сілы, — адзначыў **міністр абароны Беларусі Віктар ХРЭНІН.** — Для яе выканання мы прыцягваем не адну тысячу людзей і адзінак тэхнікі, бо з'яўляемся гарантамі міру і спакою на беларускай зямлі. У свой час у арміі маладой беларускай дзяржавы было прынята рашэнне захаваць авіяцыю. Задача была няпростая, вельмі складаная. І сёння ў баявым складзе ВПС і войскаў СПА знаходзяцца сучасныя знішчальнікі, штурмавікі, вучэбна-трэніровачныя, ваенна-транспартныя самалёты і баявыя верталёты. Але самае галоўнае — тое, што сёння за штурваламі лятальных апаратаў знаходзяцца спецыялісты, падрыхтаваныя ў нашай краіне.

Віктар Хрэнін звярнуў увагу, што не можа не непакоіць ваенная актыўнасць, якая паявлічваецца каля граніц Беларусі. Ды і магчымасці тэхнікі таксама з кожным годам узрастаюць. Таму было прынята рашэнне набыць новыя сучасныя знішчальнікі.

— Можа ўзнікнуць пытанне — чаму самалёты купілі летась, а на баявое дзяжурства яны заступаюць толькі цяпер? Справа ў тым, што праводзіўся цэлы комплекс мерапрыемстваў. Самы працяглы працэс — навучанне лётчыкаў.

Падчас паказальнага палёту экіпаж выканаў шмат фігур вышэйшага пілатажу. Цікавімся — ці не складана кіраваць новай машынай? Адна з яе пераваг — звышманеўранасць.

— Самалёт пакідае выключна станоўчыя пачуцці, — расказвае **намеснік камандзіра авіяцыйнай базы па бяспецы палётаў Андрэй КРЫВАНОСАЎ.** — Ён цяжкі, але ў кабіне ствараецца ўражанне, што кіруеш спартыўным паветраным суднам. Я лятаў на многіх самалётах, але гэты — найлепшы.

Самалёт зроблены ў Расіі. Паназіраць за тым, як новыя знішчальнікі становяцца на баявое дзяжурства, прыехаў і пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрый Мезенцаў. Ён падкрэсліў, што пастаўкі новай тэхнікі — гэта яшчэ адзін прыклад саюзніцкага ўзаемадзеяння паміж дзвюма дзяржавамі.

СУ-30СМ — не адзіны сучасны сродак узбраення, які паступіў за апошнія пяць гадоў у склад ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. Сярод новай тэхнікі — вучэбна-баявыя самалёты Як-130, транспартна-баявыя верталёты Мі-8МТВ-5, зенітныя ракетныя комплексы «Тор-М2», радыёлакацыйныя станцыі, комплексы радыётэхнічнай разведкі і радыёманіторынгу... Таксама ў гэтым пераліку варта згадаць трасавы радыёлакацыйны комплекс «Сопка-2М». Ён дазваляе шматкроць павялічыць магчымасці па вядзенні радыёлакацыйнай разведкі і якасць вымярэння характарыстык паветраных аб'ектаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# УЗОРЫ РАДЗІМЫ





*2 ліпеня ў краіне адзначылі Дзень вышыванкі. Наш фотамайстар Анатоль КЛЯШЧУК пабываў у цэнтры свята, каля сталічнага Палаца спорту, і задакументаваў яго самыя яскравыя моманты.*









